# МЕДЫЯДЗЕЙНАСЦЬ: СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ПРАЦЭСУ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле актуалізавана магчымасць даследавання журналісцкай дзейнасці як сістэмы заканамерных змен у працэсе эвалюцыйнага развіцця, што будзе садзейнічаць не толькі ўзбагачэнню навуковай базы, але і выпрацоўцы стратэгій развіцця сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі ў сучасных умовах.

***Ключавыя словы:*** гістарычнае развіццё; журналістыка; медыядзейнасць; стратэгіі; працэс; цыклічнасць; эвалюцыя.

# MEDIA ACTIVITY: MODERN APPROACHES TO STUDYING THE PROCESS

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article updates the possibility of researching journalistic activity as a system of natural changes in the process of evolutionary development, which will contribute not only to the enrichment of the scientific base, but also to the development of strategies for the development of mass media and communication in modern conditions.

***Key words:*** historical development; journalism; media activity; strategies; process; cycle; evolution.

Жыццё сучаснага чалавека прадставіць без магутнай плыні інфармацыі немагчыма. Станаўленне журналісцкай дзейнасці адбывалася паралельна з развіццём цывілізацыі праз змену форм і спосабаў

распаўсюджвання інфармацыі. Аб яе сіле гаварылі яшчэ старажытныя філосафы, асветнікі, рэлігійныя прапаведнікі, грамадскія дзеячы. Кожнаму вядомы біблейскі выраз: «У пачатку было Слова, і Слова Было ў Бога, і Слова было Бог».

У працэсе эвалюцыі дзейнасць па распаўсюджванні інфармацыі прайшла розныя этапы, «эвалюцыянавала ад прароцкіх або транслюючых інфармацыю медыятараў, ад адзінкавых карэспандэнтаў, якія паведамлялі навіны сваім гаспадарам, праз дзяржаўных чыноўнікаў, якія стаялі на службе ў правіцелей, праз карпарацыі супрацоўнікаў, якія займаліся зборам і продажам навін сваім абанентам, да сучаснага корпусу журналістаў, аднаго з мацнейшых інфармацыйных інстытутаў, які не без падстаў называюць чацвёртай уладай, да журналізму, які дзякуючы электронным сеткам і тэлебачанню стаў глабальным» [1, с. 22]. Такім чынам, працэс станаўлення і развіцця журналістыкі грунтоўны і сацыяльна значны.

У той самы час навукоўцы прыйшлі да высновы, што дадзены працэс мае цыклічны характар, развіваецца быццам бы па спіралі і на пэўным этапе вяртаецца да былых якасцей:

«З прафесійнага становіцца паўпрафесійным, з творчага – інфармацыйным, з рэальнага – віртуальным, з жоўтага – якасным, з дыялагічнага – маналагічным і г. д.» [1, с. 23]. Акрамя таго, у сучасным свеце назіраецца тэндэнцыя да раздзелу тэарэтычных уяўленняў аб месцы і задачах журналістыкі ў сучасным грамадстве з рэальнай карцінай яе дзейнасці. Так, вельмі часта журналісцкія спосабы асвятлення рэчаіснасці падмяняюцца рэкламнымі, піяраўскімі і інш. У гэтай сувязі грамадству ўсё складаней рэагаваць на змены ў сацыяльна-палітычным жыцці. Такім чынам, праблема раскрыцця сутнасці задач і заканамернасцей журналісцкай дзейнасці сёння належыць да катэгорыі прыярытэтных.

У апошні час даволі часта выказваецца меркаванне, што агульнавядомыя алгарытмы даследавання дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі не даюць чакаемых вынікаў [2]. Тым не менш, аналіз шматлікіх навукова-тэарэтычных і практычных напрамкаў журналістыкі паказвае, па-першае, што вынікі вывучэння асобных аспектаў дадзенай сферы дзейнасці прадстаўлены як пэўная сістэма, якая выпрацавала шэраг заканамернасцей. Па-другое, у сучасных умовах набывае асаблівую актуальнасць грунтоўнае даследаванне менавіта сацыяльнага аспекту медыядзейнасці ў розных сацыяльна-палітычных умовах. Гістарычны

падыход у дадзеным выпадку таксама вельмі важны, паколькі дае магчымасць, па-першае, выявіць пэўныя заканамернаці працэсу, а, па-другое, правесці аналіз усіх відаў і форм кантэнту, ахарактарызаваць функцыянальны складнік кожнага тыпу СМІ у адпаведны перыяд.

Такім чынам, актуальным сёння з’яўляецца сістэмнае даследаванне ўсіх аспектаў журналіскай дзейнасці, выучэнне медыядзейнасці як працэса заканамерных змен у сістэме сродкаў масавай інфармацыі ў пэўныя гістарычныя перыяды [3]. Такі падыход дазваляе выявіць асаблівасці эвалюцыі СМІ, прадставіць аптымальны шлях развіцця журналіскага працэсу ў сучасным і будучым.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Свитич Л. Г.* Профессия: журналист. Учебное пособие. М.: Аспект Пресс, 2003. 225 с.
2. *Стровский Д. Л.* Отечественная журналистика новейшего периода. Учебное пособие. М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2011. 359 с.
3. *Ковалева М. М.* Отечественная журналистика: вопросы теории и истории. Екатеринбург, 2000. 238 с.